Пазакласнае мерапрыемства **«Беларуская скарбонка»** для вучняў 6 класа (настаўнік Зэкава М.А.)

***Мэты:*** садзейнічаць актуалізацыі ведаў вучняў пра Беларусь, развіццю звязнай мовы, пазнавальнай актыўнасці вучняў; выхоўваць любоў да Радзімы, яе прыроды, цікавасць да вывучэння роднай мовы.

***Абсталяванне:*** мультымедыйная прэзентацыя.

ХОД МЕРАПРЫЕМСТВА

АРГАНІЗАЦЫЙНЫ МОМАНТ

Гучыць песня «Беларусы мы» (муз. В. Шмата, сл. А. Жукава)**.**

Вучань чытае верш Артура Вольскага «Радзіма».

Радзіма ў нас — бязмежная,
Спякотная і снежная
Радзіма ў нас цудоўная,
Багаццяў розных поўная.
Радзіма ў нас магутная
І ва ўсім свеце чутная.

**Вядучы.** Адкрываем «Беларускую скарбонку» — пачынаем наша свята! Прадстаўляю вам членаў журы, якія будуць не толькі падлічваць балы, атрыманыя камандамі ў розных конкурсах, але і вызначаць самых актыўных ўдзельнікаў ў зале.

Зразумела, пра родную старонку трэба расказваць на роднай мове.

Вучні чытаюць верш Віктара Шведа «Я нарадзіўся беларусам».

Я нарадзіўся беларусам,
Беларусам буду жыць!
Мову родную вучуся
Шанаваць, цаніць, любіць

Сваю родную старонку
Я люблю, як і бацькоў,
Што вучылі песні звонкай,
Прывівалі мне любоў.
І да мовы, да дубровы,
Да палёў і да лугоў
І заўсёды да народа,
Што жыве тут ад вякоў.

Я клянуся: не зракуся
Сваё роднае любіць.

Быў і буду беларусам,
Покуль толькі буду жыць.

**Вядучы.** Давайце зараз праверым, што вы ведаеце пра сваю Радзіму.

**Конкурс «Патрыёт»**

**Вядучы.** Але перш чым пачаць конкурс, давайце высветлім значэнне слова «патрыёт». (Адказы вучняў.)

Вядучы задае пытанні па чарзе кожнай камандзе. Хто ведае, падымае руку. Адказвае толькі той вучань, на якога пакажа вядучы. Правільны адказ — 1 бал.

Пытанні конкурсу:

- ✓ Назавіце сталіцу Рэспублікі Беларусь (*Мінск*)
- ✓ Назавіце колеры беларускага сцяга? (*Чырвоны, зялёны, белы*)
- ✓ Як называецца Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь? (*Канстытуцыя*)
- ✓ Калі адзначаецца Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (*3 ліпеня*)
- ✓ Як павінен паводзіць сябе чалавек, калі гучыць гімн яго дзяржавы?
- ✓ Назавіце самую вялікую раку Беларусі?
- ✓ Якіх беларускіх пісьменнікаў і паэтаў вы ведаеце? Чаму беларусаў называюць бульбашамі? (Бульба — другі хлеб беларусаў, самая любімая страва)

**Вядучы.** Журы падлічвае балы, а мы працягваем.

Вучань чытае ўрывак з верша Максіма Танка «Родная мова».

З легендаў і казак былых пакаленняў,
З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,
З сузор'яў і сонечных цёплых праменняў,
З грымучага ззяння бурлівых крыніц,
З птушынага шчэбету, шуму дубровы,
І з гора, і з радасці, і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Святыні народа, бяссмерця яго, —
Ты выткана, дзіўная родная мова.

**Вядучы.** А зараз наступны…

**Конкурс «Знаўца роднай мовы»**

**Вядучы.** У кожнага з вас ёсць нумарок. Зараз я, выцягнуўшы нумар, вызначу, хто будзе ўдзельнічаць у гэтым конкурсе ад кожнай каманды.

**Вядучы.** Удзельнікі выконваюць заданне на сцэне, а астатнія, гледзячы на экран, таксама могуць выканаць гэта заданне. Але давайце дамовімся, што ніхто не будзе падказваць з месца.

Заданне конкурсу: назавіце адным словам:

- ✓ пчала, жук, чмель (насякомыя);
- ✓ званочак, рамонак, васілёк (кветкі);
- ✓ верабей, ластаўка, сарока (птушкі);
- ✓ сукенка, спадніца, футра (адзенне);
- ✓ заяц, воўк, мядзведзь (звяры);
- ✓ чаравікі, боты, туфлі (абутак).

Лісткі з выкананым заданнем правярае журы, улічваючы і правільнасць адказаў, і запіс слоў на беларускай мове.

Расказваюць вучні.

- ➢ Белая Русь...Чаму назва такая?
  Тут трэба ўдумацца і не спяшацца.
  Белая — чыстая, як шкло празрыстая,
  Светлая, як зімняй раніцай снег.
- ➢ Белая — ад колеру адзення, якую насілі нашы продкі. Адзенне шылі з ільну, кветкі гэтай расліны ёсць нават на нашым гербе.
- ➢ Белая — ад светлых валос нашых продкаў. Хто ў нас з такім колерам валос?
- ➢ Белая — значыць свабодная. Беларусы ніколі не захаплялі чужыя землі. Але сваю зямлю абаранялі, не давалі ворагам завалодаць сваёй зямлёй.
- ➢ «Зямля пад белымі крыламі» — так назваў Беларусь наш зямляк Уладзімір Караткевіч. Гэта крылы буслоў, якія селяцца толькі там, дзе жывуць добрыя і чулыя людзі.

**Вядучы.** А ў нас наступны…

**Конкурс «Markdown»**

**Вядучы.** Хто перакладзе слова *вясёлка* на рускую мову?

**Вядучы.** Вызначаем удзельнікаў гэтага конкурсу.

Вядучы выцягвае нумар удзельніка.

**Вядучы.** Заданне конкурсу: запісаць колеры вясёлкі на беларускай мове.

Красный — …

Оранжевый — …

Жёлтый — …

Зелёный — …

Голубой — …

Синий — …

Фиолетовый — …

**Вядучы.** Час выйшаў, перадайце лісткі журы. Давайце праверым усе разам: я называю колер на рускай мове, а вы хорам на беларускай. (Праверка)

Расказваюць вучні.

- Вось ён — сцяг нашай дзяржавы, галоўны сімвал нашай Радзімы. Ён мае тры колеры. Чырвоны колер служыць знакам Сонца, перамогі і шчаслівага жыцця.
- Зялёны колер — гэта колер Прыроды. Гэта колер палёў і лясоў, якія займаюць асноўную частку тэрыторыі нашай дзяржавы. Гэта колер дабрыні і развіцця.
- Белы колер — колер чысціні і мудрасці. Такім павінен быць кожны сапраўдны грамадзянін сваёй Радзімы.
- Сцяг Беларусі мае і арнамент. Арнамент — гэта сімвалічны малюнак, з дапамогй якога людзі выражалі розныя пачуцці і пажаданні ў тыя часы, калі яшчэ не было пісьменнасці.

**Вядучы.** Наступны конкурс…

**Конкурс «Смачныя ягады»**

Вядучы выцягвае нумар ўдзельніка.

**Вядучы.** Вы ведаеце, што большую частку тэрыторыі нашай краіны займаюць лясы. А ў лесе можна знайсці шмат смачных ягад. Ваша задача: запісаць каля лічбы патрэбную назву — малюнкі ягад вы бачыце на экране.

**Вядучы.** Удзельнікі здаюць лісты журы, а мы разам правяраем.

Вучань чытае верш Петруся Броўкі «Бусел».

Я помню хаціну дзіцячых гадоў,
Падкову на абітым парозе,
Вялізнае, з дзедаву шапку, гняздо
Буслоў на высокай бярозе.
Жылі з бuслянятамі аж да зімы
Ды лёталі на сенажаці…
Казалі суседзі — шчаслівыя мы;
Я жыў, адчуваючы шчасце,

Бо бачыў, як бусел імкліва ўзлятаў,
Імчаў на багнішчы, у лозы.
Я бегаў глядзець і не раз пазнаваў
Свайго са старое бярозы.

Расказваюць вучні.

- Белы бусел з’яўляецца сімвалам Беларусі. Гэта птушка карыстаецца асаблівай павагай у беларусаў, таму ёй нават будавалі аснову для гнязда — буслянку. Народная традыцыя забараняе разбураць гняздо бусла. Яго лічылі ахоўнікам жытла. Асноўны колер апярэння гэтай птушкі — белы. Бусел — жывы носьбіт нацыянальнай сімволікі колераў.
- Яшчэ адзін сімвал нашай Радзімы — зубр. Толькі ў Беларусі гэты магутны звер жыве на волі. Зубр — сімвал магутнасці і дабрыні.

**Вядучы.** Апошні…

**Конкурс «Паляванне на арфаграмы»**

**Вядучы.** Хто перакладзе слова *паляванне* на рускую мову?

**Вядучы.** Паляванне на зуброў забаронена законам Рэспублікі Беларусь. А вам забаронена рабіць памылкі ў сшытках! Таму мы зараз іх будзем выпраўляць.

Вядучы выцягвае нумар удзельніка.

Заданне: знайсці 10 памылак.

*Па прыгажосці Белавежская пу****щ****а займае першае месца сярод лясо****у******б****еларусі. Тут ж****і****ве многа розных зв****е****роў і* ***птіц****. Белавежская пу****щ****а — а****д****інае ў све****т****е месца, дзе з часоў ледніковага перыяду жыве на волі зубр — дзікі першабытны л****е****сны бык* (В.Вольскі).

**Вядучы.** Здаём лісты журы, а мы правяраем усе разам. Адказвае той, каго выклікае вядучы. (Праверка)

Вучні чытаюць верш Артура Вольскага «Непаўторны край».

То ялінкі, то сасонкі
Падпіраюць небакрай…
Прыгажэйшая старонкі
Не знайсці, як ні шукай.

Скачуць сонейка асколкі
Пасля дожджыку ў вадзе.
Весялейшае вясёлкі
Не пабачыш анідзе.

Пахне збожжа свежым хлебам.
Сыпле золата жніво.
Жаўрукі звіняць пад небам —
Славяць свету хараство.

На бярозе — белы бусел.
Пад бярозаю — ручай.
А завецца Беларуссю
Непаўторны родны край.

Журы падводзіць вынікі: размяркоўвае месцы, якія заняла кожная каманда; вызначае лепшых у зале.

**Вядучы.** А мы пакуль пагуляем з вамі ў цікавую гульню «Знайдзі колер». Правілы гульні: я называю колер, вы шукаеце прадмет такога колеру ў сябе. У каго такі колер ёсць, ён хуценька падымаецца, трымаючыся за прадмет рукою. Пачынаем: *блакітны, аранжавы, чорны, ружовы, чырвоны, сіні, белы, шэры, фіялетавы, зялёны.*

**Вядучы.** Слова атрымлівае журы.

Члены каманды-пераможцы атрымліваюць узнагароды, усе удзельнікі свята — падарункі.